**Баграновіч, Н.** Пяць лістоў «пад капірку» / Н. Багдановіч // Патрыёт (Ушачы). — 2021. — 13 лют. — С. 1—2.

## ПЯЦЬ ЛІСТОЎ «ПАД КАПІРКУ»

*Пра тое, што на наступны дзень трэба быць у ваенкамаце, Пецю Крупеню па тэлефоне паведаміў бацька. Са Смальян, дзе хлопец вучыўся на агранома, даехаць да родных Судзілавіч было складана – пакуль дабіраўся да Лепеля, спазніўся на вячэрні мінскі аўтобус, але варыянт не прыбыць раніцай па павестцы быў настолькі непрымальны, што юнак усю ноч ішоў ва Ушачы пешшу.*



Служба для нашага земляка пачалася з танкавай вучэбкі ў туркменскім горадзе Тэджэн, а вясной 1983-га ў Кабуле прызямліўся самалёт, па трапе якога ў ліку іншых навабранцаў сышоў будучы механік-вадзіцель сапёрнай роты дэсантна-штурмавой брыгады Пётр Крупеня. На бліжэйшыя паўтара года месцам яго прабывання стаў палатачны гарадок у Гардэзе, што ў 110 кіламетрах на поўдзень ад сталіцы. Але непасрэдна «на базе» ён правёў агульным чынам месяцаў 5–6 – на астатні час прыпалі баявыя «камандзіроўкі». Вадзіць Пятру давялося інжынерную машыну БТС – амаль той жа танк, толькі з кулямётам замест башні ды з траламі для выяўлення мін на дарозе. Іх задачай было ехаць наперадзе калон, расчышчаючы ім шлях. Хапала і руціннай працы па абслугоўванні і рамонце тэхнікі. Якраз гэтым быў заняты герой аповеду ў адзін з дзён, калі раптам у аўтапарк прыбеглі са штаба брыгады з трывожным паведамленнем: у гарах кіламетраў за сорак ад іх душманы акружылі разведроту. На выручку байцам тут жа адправіўся выратавальны дэсант, у складзе якога аказаўся і Пётр. «Сутыкненне было жорсткім, – прыгадвае ён. – Маджахедам удалося падбіць адзін з нашых танкаў, два члены экіпажа былі паранены. На полі бою загінуў маладзенькі лейтэнант з рамонтнай роты, які толькі днямі прыбыў у брыгаду. Калі мы адбілі разведчыкаў і бой скончыўся, яго цела пагрузілі ў наш БТС...»

Гэты эпізод ніколі не сцерці з памяці. Нагадвае пра яго і медаль «За баявыя заслугі», атрыманы за тую аперацыю. Трэба сказаць, што на першым этапе вайны кіраўніцтва было не надта шчодрым на ўшанаванні – Пётр стаў другім у раёне афганцам, удастоеным баявой узнагароды. Яшчэ больш складана было заслужыць ордэн. Але магчыма! «Быў у нашай роце сапёр, якога звалі Валерый Ордэнаў. Якраз калі я прыбыў у брыгаду, ён пасля сур'ёзнага ранення абедзьвюх ног мог датэрмінова адправіцца ў Саюз, аднак папрасіў камандаванне, каб яму дазволілі застацца. Казаў, як жа я вярнуся дамоў на паўгода раней, мне ж сорамна будзе. Пайшоў на дэмбель з хлопцамі свайго прызыву, а за геройскі ўчынак падчас адной з аперацый атрымаў Ордэн Чырвонай Зоркі, цалкам апраўдаўшы сваё гаваркое прозвішча!», – распавядае Пётр Пятровіч.

Засталіся ў памяці і яркія моманты салдацкага быту, які ў іх брыгадзе ўсяляк імкнуліся аздобіць – напрыклад, з аміячных бочак змайстравалі сцэну для клуба, дзе ладзіліся кінасеансы і выступленні артыстаў – неяк завітаў з канцэртам нават сам Леў Лешчанка.

Аднаго разу нашага земляка нечакана выклікалі ў штаб – аказалася, з Судзілавіч у далёкі Гардэз прыйшла пасылка: гэты факт быў дзіўны, бо ў той час для падобных адпраўленняў патрабаваўся спецыяльны дазвол. З 28 чалавек роты, здаецца, ніхто дагэтуль іх не атрымліваў. Нядзіўна, што самому адрасату лічы што нічога і не дасталася: апалавінілі скрыню яшчэ ў штабе, ды і кожнага сапёра трэба было пачаставаць: хоць гродзенскай цыгарэткай, хоць мінскай цукеркай...

А таямніцу той пасылкі адкрыла мне мама воіна-інтэрнацыяналіста Паліна Кузьмінічна: «Мой муж, Пётр Іванавіч, у тыя гады саўгасную партарганізацыю ўзначальваў, за актыўнасць і прынцыповасць быў у пашане ў раённага кіраўніцтва, вось і звярнуўся непасрэдна да першага сакратара райкама Ніканора

Міхайлавіча Гірсы, каб той пасадзейнічаў дазволу. Вядома ж, на раённым узроўні гэта наўрад ці вырашалася, але пасылку ў нас прынялі!»

У першыя ж паўгода службы ў Афганістане да сына не даходзілі нават лісты ад бацькоў. Ад Пятра пісьмы былі, але без акалічнасцяў і зваротнага адрасу – Крупені нават не ведалі, дзе служыць іх сын. Ды і тады, калі пісаць пра Афган дазволілі, хлопцы стараліся не паведамляць блізкім лішняга.

За час службы Пётр перажыў шмат выпрабаванняў. Апошні такі момант быў непасрэдна перад адпраўкай у Саюз: літаральна на яго вачах афганцы збілі два транспартных верталёты (за вялікі памер іх называлі «каровамі») – менавіта на іх хлопцы павінны былі пакінуць месца службы. А замест гэтага шукалі астанкі загінуўшых пілотаў... На наступны дзень «каровы» прыляцелі ўжо з іншага боку, і перш чым сесці на борт, дэмбелям давялося выканаць апошняе афганскае заданне: разгрузіць з салона зброю і боепрыпасы для тых, хто заставаўся на чужой зямлі...

«Пашанцавала нам моцна. Пеця, напэўна, у кашулі нарадзіўся, – задумліва кажа Паліна Кузьмінічна. – Абышлі яго афганскія кулі і снарады, ды і хваробы не чапляліся». А яшчэ прыгадвае той дзень, калі малодшы сын без папярэджання вярнуўся дамоў. Першай убачыла яго бабуля, бо жыла бліжэй да пачатку вёскі, маці ж у гэты час даіла ў хляве карову... Прынамсі, ішоў Пеця са службы таксама пешшу. Праўда, усяго некалькі кіламетраў, што аддзяляюць Судзілавічы ад шашы: аўтобус, які заходзіць у іх вёску, адпраўляўся з Ушач крыху пазней, і ён паехаў на бліжэйшым, што кіраваўся на Дольцы – а тыя кіламетры да роднай хаты лічы што прабег!

...Колькі год прайшло з тых падзей. Шмат і радаснага, і горкага было ў лёсе іх сям'і. Адслужыў у Венгрыі і вярнуўся дамоў старэйшы брат Іван, сярэдні Сяргей марыў пра неба, вывучыўся на лётчыка, але трагічны выпадак абарваў яго жыццё. Ну а Пётр пасля арміі вярнуўся ў тэхнікум, працаваў у «Кублічах» памочнікам агранома, брыгадзірам, а калі справы ў гаспадарцы пайшлі кепска, уладкаваўся паштальёнам. Кажа, што гэтая работа вельмі падабалася: добразычлівага мужчыну з нецярпеннем чакалі ў навакольных вёсках, шкада, што праз тры гады штат аддзялення скарацілі – і з працай цяпер вельмі складана...

Зараз Паліна Кузьмінічна і два яе сыны – адны з нешматлікіх жыхароў, што засталіся ў вёсцы. Мужчыны вырошчваюць агародніну, трымаюць птушку, ходзяць у лес і на рыбалку. А якімі смачнымі яблычкамі з уласнага саду мяне пачаставалі! Гады і перажыванні дадалі іх матулі маршчын і хвароб, але яе вочы, якія ўжо мала што бачаць, застаюцца пяшчотнымі і прамяністымі. А як святлее твар жанчыны, калі яна распавядае пра нявестку, унукаў і маленькую праўнучку, якую таксама назвалі Палінкай. Хай будзе яна шчаслівай і ніколі не чытае лісты «пад капірку»...

**Н. БАГДАНОВІЧ.**